Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№96 (28460)

24 МАЯ 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

стар. 5–12

Як прывабіць інвестыцыі?

Бабруйская фанера для амерыканцаў

Псіхічная залежнасць ад электронных цыгарэт

СТАР. 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый КРУТОЙ, першы намеснік міністра эканомікі:

«За студзень—красавік у гадавым выражэнні прырост спажывецкіх цэн знізіўся да 6,3% пры мэце на 2017 год — 9%, а за чатыры месяцы да снежня мінулага года мы маем інфляцыю 2,4%. За пяць месяцаў урад чакае інфляцыю на ўзроўні 2,5%. Улетку ў нас традыцыйна адбываецца сезоннае змяненне цэн на агародніну, таму ў асобныя месяцы, як, напрыклад, у жніўні мінулага года, можа быць нават дэфляцыя. Па бягучых ацэнках мы чакаем гадавую велічыню індэкса спажывецкіх цэн на ўзроўні 5,5—6%. Гэта будзе практычна рэкорд».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.05.2017 г.

Долар ЗША	1,8524	▼
Еўра	2,0834	▲
Рас. руб.	0,0327	■
Укр. грыўня	0,0704	▲

ISSN 1990 - 763X

«Юнацтва» меліяратараў

Ва Ушачах узводзіцца важны сацыяльны аб'ект — фізкультурна-аздараўленчы комплекс «Юнацтва». Будоўля ўжо ў завяршальнай стадыі. Самы непасрэдны ўдзел ва ўзвядзенні комплексу прымаюць і свае — ушацкія меліяратары. Яны падрыхтавалі пляцоўку пад аб'ект і інжынерныя сеткі і перамясцілі дваццаць адну тысячу кубаметраў грунту. А цяпер робяць канчатковае выраўноўванне пляцоўкі пад зялёную зону.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Галоўны інжынер УП «Ушацкая ПМС» Мікалай ФЯДОСЕНКА *(справа)*, які працуе ў меліярацыі амаль сорак гадоў, з ім — машыніст пагрузчыка Міхаіл ЛАВУШКО і машыніст-бульдазерыст Уладзімір ТАРАКАНАЎ на пляцоўцы, дзе вядуцца асноўныя работы па падрыхтоўцы тэрыторыі да здачы аб'екта.

■ Бяда

РАЗБІТАЕ СЭРЦА МАНЧЭСТЭРА

Брытанская паліцыя паведаміла, што, па апошніх даных, у выніку меркаванага на дадзены момант тэракта на «Манчэстэр-арэне» загінулі 22 чалавекі, у тым ліку некалькі дзяцей. Атаку ажыццявіў адзін чалавек, які таксама загінуў, пацвердзілі ў паліцыі. Высвятляецца, ці мог ён быць звязаны з іншымі зламыснікамі.

Пра гэта заявіў кіраўнік паліцыі горада Ілэн Хопкінс. Паводле яго слоў, сярод загінулых — некалькі дзяцей. Раней паведамлялася пра 19 ахвяр меркаванага тэракта. Колькасць параненых, якія шпіталізаваныя, склала 59 чалавек.

Паліцыя лічыць, што чалавек, які ажыццявіў выбух, пранёс у канцэртную залу выбуховае прыстасаванне і прывёў яго ў дзеянне. Ён таксама загінуў. Цяпер паліцэйскія спрабуюць высветліць, ці былі ў яго саўдзельнікі, якія не прымалі непасрэднага ўдзелу ў нападзе.

«На гэтым этапе расследавання мы мяркуем, што напад ажыццявіў адзін чалавек, — сказаў Хопкінс. — Цяпер самае галоўнае ўстанавіць, дзейнічаў ён у адзіночку ці быў часткай тэрарыстычнай сеткі». Кіраўнік паліцыі не ўдакладніў, ці знойдзены на месцы трагедыі цела нападніка або фрагменты выбуховага прыстасавання. Ён таксама адмовіўся адказваць на пытанне аб грамадзянстве і нацыянальнасці чалавека, які ажыццявіў тэракт.

Па словах Ілэна Хопкінса, «гэта было самае жахлівае здарэнне з усіх, якія калі-небудзь бачыў горад». Паліцыя заклікае грамадзян не рабіць заўчасных высноў аб тым, хто нападаў, і яго матывах.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Каралеве Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі Лізавеце II, родным і блізкім загінулых у выніку тэракта ў Манчэстэры, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

«Да глыбіні душы ўзрушаны жудаснай трагедыяй на стадыёне «Манчэстэр-арэна», у выніку якой загінулі і пацярпелі нявінныя людзі», — гаворыцца ў спачуванні.

Беларусы падзяляюць гора і боль сем'яў ахвяр, смуткуюць разам з усім народам Злучанага Каралеўства. «Мы рашуча асуджаем учынены тэрарыстычны акт, як і ўсе формы тэрарызму, экстрэмізму і рэлігійнага радыкалізму», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што запалохванне грамадства не можа быць сродкам дасягнення якіх бы там ні было мэт.

СТАР. 2

ВЫЙСЦІ З ЛЕСУ

Як не згубіцца на «ціхім паляванні»?

Нягледзячы на тое, што вясна сёлета выдалася даволі позняя, людзі ўжо выбіраюцца ў лясы. Але не заўсёды вяртаюцца дадому своечасова. Літаральна на мінулым тыдні стужкі інфармацыйных агенцтваў абляцела навіна аб бабулі, якая правяла ў лясах Хоцімскага раёна трое сутак і якую знайшлі падчас пошукаў.
Як жа не зацягнуць неспадзявана для сябе паход у грыбы і ягады на нявызначаны тэрмін? І што рабіць, калі вы ўсё ж заблукалі? Аб гэтым карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з памочнікам міністра па надзвычайных сітуацыях Віталем НАВІЦКІМ.

Рыхтуемся да шпацыру

— Галоўная праблема, з якой сутыкаюцца ратавальнікі і міліцыя падчас пошуку зніклых у лесе, — гэта тое, як людзі апранаюцца, — расказвае Віталь Навіцкі. — Шмат хто лічыць, што найбольш практычная вопратка для паходаў у лес — гэта стары добры камуфляж. Яго выбіраюць таму, што ён утульны, шчыльны і добра абараняе ад кляшчоў. Але разам з тым ён выдатна выконвае сваю першапачатковую функцыю — маскіраваць апранутага ў яго. І тады заўважыць зверху чалавека сярод зеляніны амаль немагчыма. Праўда, на гэтую акалічнасць зважаюць не ўсе. У тэстах у нашай мабільнай праграме «Дапамога побач» найбольшы працэнт памылак выдаецца пры адказе менавіта на гэтае пытанне.

СТАР. 3

МЭТА — ДАБРАБЫТ ГЛЫБІНКІ

Прэзідэнт сустрэўся са старшынёй Камітэта рэгіёнаў ЕС

Клопат пра людзей з глыбінкі — менавіта гэта задача яднае беларускія ўлады і Камітэт рэгіёнаў Еўрапейскага саюза. Днямі ў Мінск прыбыў старшыня гэтай арганізацыі Марку Маркула, кіраўнік дзяржавы сустрэўся з ім учора ў Палацы Незалежнасці. Падчас размовы акцэнт ставіўся на эканамічным супрацоўніцтве муніцыпальнага ўзроўню.

Трэба сказаць, што эканамічная палітыка нашай дзяржавы яшчэ з 90-х гадоў базіравалася на падтрымцы вёсак, малых гарадоў.

— Вельмі рады з вамі сустрэцца — яшчэ і ў сілу таго, што вы займаецеся вельмі сур'ёзнай праблемай, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — З гэтымі праблемамі мы сутыкаемся даўно, яшчэ з савецкіх часоў. Гэта тыя праблемы, якімі жывуць нашы людзі там, у глыбінцы, на месцах: у сёлах, малых гарадах. Мы з'яўляемся надзейнымі партнёрамі ўсіх тых, хто ў Еўропе дбае пра добрае і шчаслівае жыццё людзей, што жывуць перш за ўсё ў глыбінцы.

Днямі ў сталіцы прайшло пасяджэнне Бюро Канферэнцыі рэгіянальных і мясцовых органаў улады Усходняга партнёрства, у якім прынялі ўдзел каля 20 прадстаўнікоў структур Еўрасаюза.

— Вашы мерапрыемствы, якія прайшлі ў Беларусі, якраз цесна ўплятаюцца ў тканіну нармалізацыі адносін Беларусі з Еўропай, — звярнуў увагу кіраўнік краіны. — Вы выпрацоўваеце адпаведныя рэкамендацыі Еўрапейскаму саюзу па вялікім спектры адносін паміж Беларуссю і Еўрасаюзам — асабліва для арганізацыі Усходняга партнёрства. Я вам вельмі ўдзячны за тыя кірункі супрацоўніцтва, якія былі разгледжаны перш за ўсё ў Беларусі падчас пасяджэння вашага бюро. Я цалкам упэўнены, што візіт вашых спецыялістаў з'явіцца чарговым крокам у наладжванні добрасуседскіх адносін паміж Беларуссю і Еўрапейскім саюзам.

Прэзідэнт прызнаўся, што ён быў асабіста зацікаўлены ў прыездзе ў Беларусь старшыні Камітэта рэгіёнаў ЕС:

— Інтарэс мой заключаецца ў тым, каб вы бліжэй пазнаёміліся з Беларуссю і ўбачылі адкрытасць нашай краіны. Ну і яшчэ асабісты, прагматычны інтарэс. Я ні разу не быў на вашай радзіме ў Фінляндыі, але чамусьці мне здаецца, што гэта тая краіна, з якой мы павінны браць па многіх кірунках прыклад, як трэба ўладкоўваць сваю краіну. Думаю, што ў вольны ад асноўнай працы час вы ўдзеліце трошкі ўвагі для таго, каб зблізіць Фінляндыю з Беларуссю. Мы ў гэтым вельмі зацікаўленыя.

Марку Маркула падзякаваў за цёплы прыём і расказаў, што арганізацыя, якую ён прадстаўляе, налічвае каля 350 членаў. Гэта кіраўнікі лакальных і рэгіянальных урадаў. Старшыня Камітэта рэгіёнаў таксама звярнуў увагу, што ўплыў арганізацыі ў Еўропе дастаткова высокі. Па яго словах, асаблівую ўвагу Камітэт рэгіёнаў ўдзяляе «як і ўлады Беларусі, жыхарам гарадоў, вёсак, невялікіх населеных пунктаў» таму, каб забяспечыць патрэбны ўзровень сацыяльнай забяспечанасці і неабходны ўзровень жыцця.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■ Знешняя палітыка

Вышэйшы дзяржсавет Саюзнай дзяржавы пройдзе ў чэрвені

Пасяджэнне Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы адбудзецца 30 чэрвеня ў Маскве. Пра гэта ўчора паведаміў міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ на сустрэчы з маладымі дыпламатамі і ветэранамі дыпламатычнай службы Беларусі і Расіі.

— У канцы чэрвеня адбудзецца Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які праходзіць пад патранажам нашых прэзідэнтаў. 30 чэрвеня адбудзецца пасяджэнне Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы, — сказаў Уладзімір Макей.

Правядзенню Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы будзе папярэднічаць пасяджэнне калегіі МЗС Беларусі і Расіі.

— Мы будзем абмяркоўваць шэраг актуальных пытанняў нашага ўзаемадзеяння, — праінфармаваў кіраўнік дыпламатычнага ведамства краіны.

Візіт у Мінск прадстаўнікоў ветэранскіх і маладзёжных структур прафсаюзнай арганізацыі МЗС Расіі праходзіць у фармаце мерапрыемстваў, прымеркаваных да 25-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж дзвюма краінамі.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

Капітал для паўднёвага рэгіёна

Падведзены вынікі XIV Гомельскага эканамічнага форуму

Толькі на пленарным пасяджэнні падпісаны дагаворы на суму амаль 63 мільёны долараў. Інвестпраекты павінны адыграць важную ролю ў эканамічным развіцці Гомельшчыны і краіны ў цэлым. Усяго ж у форуме паўдзельнічалі прадстаўнікі 16 краін свету.

Намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Уладзімір СЯМАШКА, вітаючы ўдзельнікаў форуму, акцэнтаваў увагу на тым, што ў Гомельскай вобласці заўсёды надаецца вялікае значэнне інавацыйнай і інвестыцыйнай дзейнасці:

— У наш час тут рэалізуецца некалькі сур'ёзных інвестпраектаў: мадэрнізацыя Мазырскага НПЗ, будаўніцтва завода сульфатнай беленай цэлюлозы ў Светлагорску, Петрыкаўскага горна-ўзбагачальнага комплексу, а ў Добрушы — завода па вытворчасці кардону. Гэта дазволіць павялічыць аб'ёмы вытворчасці і стварыць новыя працоўныя месцы.

Гомельшчына мяжуе з Расіяй і Украінай. Менавіта праз вобласць праходзяць самыя буйныя чыгуначныя і аўтамабільныя магістралі, якія звязваюць Балтыйскае і Чорнае моры. Паўднёва-ўсходняя вобласць Беларусі з'яўляецца важным транзітным калідорам паміж краінамі Еўрасаюза і Еўразійскага эканамічнага саюза. Да таго ж амаль 70% радовішчаў карысных выкапняў рэспублікі размешчана ў гэтым рэгіёне.

— Мы імкнёмся, каб інвестыцыйная палітыка была доўгатэрміновай і забяспечвала рацыянальнае ўзаемадзеянне дзяржаўнага і прыватнага капіталу, — адзначыў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК.** — Сур'ёзным кірункам для развіцця прамысловага патэнцыялу асобных рэгіёнаў Гомельскай вобласці з'яўляецца засваенне альтэрнатыўных крыніц энергіі, магчымасць кааперацыі ў металургіі. Па-ранейшаму актуальнымі ў цэлым для рэгіёна застаюцца пытанні вытворчасці прадуктаў харчавання, перапрацоўкі адходаў і максімальнага выкарыстання рэсурсаў, у тым ліку карысных выкапняў. Штогод укладваем рэсурсы ў развіццё неабходнай інавацыйнай інфраструктуры, тэхнапаркаў, свабоднай эканамічнай зоны і інкубатараў бізнесу. Нашы дзелавыя партнёры змогуць у поўнай меры скарыстацца ўсімі перавагамі такіх інтэграцый, як Мытны саюз і Еўразійскі эканамічны саюз.

Падчас пленарнага пасяджэння падпісана 10 дакументаў, у тым ліку два дагаворы і восем пратаколаў пра намеры. У прыватнасці: на тэрыторыі Мазырскага раёна з удзелам беларуска-дацкай кампаніі ТАА «Байсцілл» будзе створана вытворчасць па нанясенні палімернага пакрыцця на металічныя паверхні. Яшчэ адзін інвестдагавор датычыцца арганізацыі вытворчасці новых цукерак на базе фабрыкі «Спартак». Пяць аб'ектаў нерухомасці прададзена на аўкцыёне, які правёў фонд «Гомельаблмаёмасць». Падпісаны дагавор пра супрацоўніцтва паміж Гомельскай вобласцю і аўтаномным краем Ваяводзіна Сербіі.

Падчас работы Гомельскага эканамічнага форуму прайшла і выстаўка «Вясна ў Гомелі», дзе сваю прадукцыю прадставілі прамысловыя і турыстычныя прадпрыемствы Беларусі, Бранскай (Расія), Чарнігаўскай (Украіна) абласцей і Гагаузіі (Малдова), а таксама 180 рамеснікаў з Беларусі, Расіі і Украіны.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

■ Меркаванне

АДБІРАЦЬ ЦІ НЕ ПУСКАЦЬ?

У першай палове мая пасажыры, якія рэгулярна падарожнічаюць паміж ЗША і Еўропай, замерлі ў прадчуванні непрыемнасцяў — у СМІ была анансавана забарона правозу ноўтбукаў у ручной паклажы на рэйсах у гэтым кірунку. Папярэдне было дакладна вядома, што абмежаванні закрануць Заходнюю і Усходнюю Еўропу, але ўсё магло аказацца значна шырэй, бо трактоўка амерыканскімі авіякампаніямі еўрапейскай геаграфіі магла аказацца недакладнай. Першая праблема заключаецца ў тым, што па розных класіфікацыях ва Усходнюю Еўропу ўключаюць не толькі Расію, Беларусь, Украіну, Румынію, Малдову, Балгарыю, Сербію, Грузію, Арменію і Азербайджан, але часта і Польшчу, Венгрыю, Чэхію, Славакію (якія называюць сябе Цэнтральнай Еўропай), а таксама і Літву, Латвію і Эстонію (калі разглядаць класіфікацыю ЮНЕСКА), якія самі сябе пазіцыянуюць як Паўночную Еўропу. Другая праблема ў тым, што рашэнне абмежавацца толькі Заходняй і Усходняй Еўропай у класічным разуменні было незразумелым з пункту гледжання патрэб бяспекі. З усіх названых краін Усходняй Еўропы, якая разглядалася ў максімальна шырокім разуменні, тэрарыстычныя рызыкі павышаны перш за ўсё ў Расіі і Украіне, а ў тых жа краінах Балтыі, напрыклад, тэрарызм практычна нулявы.

Так што цалкам магло аказацца, напрыклад, што пад Заходняй Еўропай у ЗША разумеюць аўтаматычна і Паўднёвую, якая ў найбольшай ступені прылягае да рэгіёнаў з высокай рызыкай тэрарызму. Гэта вынікае са зробленых раней дзеянняў. У сакавіку гэтага года ЗША ўжо забаранілі праносіць у ручной паклажы тэхніку пасажырам, якія перамяшчаюцца з 10 аэрапортаў, у тым ліку з ААЭ, Саудаўскай Аравіі, Катара, Турцыі і іншых усходніх краін і краін Паўночнай Афрыкі. А гэтыя дзяржавы знаходзяцца на парозе Паўднёвай Еўропы, а зусім не Заходняй. Калі браць зноў жа прыклад нядаўна ўведзеных абмежаванняў у Вялікабрытаніі, то там пасажырам з гэтага рэгіёна ўжо нельга правесці нічога, акрамя мабільнага тэлефона, абмежаванні распаўсюджваюцца, акрамя ноўтбукаў, і на планшэты і фотаапараты. А ўсё пачыналася некалькі гадоў таму ўсяго толькі з забароны браць з сабой у салон ваду.

З пункту гледжання бяспекі такое новаўвядзенне ўяўлялася сумнеўным. Калі так ужо асцерагаюцца выбухоўкі ў гаджэце, то заўсёды ёсць просты спосаб праверыць — папрасіць пасажыра яго ўключыць. Сам неаднаразова бачыў, як гэта адбываецца ў аэрапортах падчас праходжання кантролю бяспекі, і пытанне вырашаецца на месцы вельмі хутка. Вытворцы складанай тэхнікі настолькі спаборнічаюць у мініяцюрызацыі сваіх вырабаў, што ўставіць у сучасны ноўтбук або планшэт выбухоўку без страты працаздольнасці прылады практычна немагчыма. Ну а калі папаўся ўжо зусім стары цяжкі ноўтбук — адзін раз на дзвесце пасажыраў — то яго можна праверыць і больш дэталёва.

Але гэта мы можам разважаць такім чынам, а сілавыя структуры, ахопленыя службовым запалам, звычайна робяць так, як ім расцей. Няма ноўтбука ў ручной паклажы — няма і пытання аб тым, ці можа ў ім быць выбухоўка.

17 мая адбыўся скандал, з якога стаў зразумелы такі намер па забароне ноўтбукаў. Па выніках сустрэчы Прэзідэнта ЗША Трампа з міністрам замежных спраў Расіі Лаўровым у прэсу прасачылася інфармацыя, што сакрэтны агент адной з дружалюбных да ЗША краін паведаміў аб намеры «Ісламскай дзяржавы» падарваць пры дапамозе замініраванага ноўтбука амерыканскі самалёт.

У выніку 18 мая пасля перагавораў паміж прадстаўнікамі ЕС і чыноўнікамі Міністэрства ўнутранай бяспекі ЗША стала вядома, што забарона на правоз ноўтбукаў усё ж уводзіцца не будзе. Якім чынам удалося ўгаварыць сілавікоў адмовіцца ад яе?

Зразумела, што многія пасажыры пацярпелі б, калі б з сабой нельга было пранесці ноўтбук. У найбольшай ступені цяжка прыйшлося б архітэктарам, у якіх на вельмі дарагія ноўтбукі ўстаноўлены магутныя праграмы, што каштуюць тысячы долараў. Іх у звычайны багаж дакладна здаць не рызыкнеш. Няпроста прыйшлося б і вучоным, якія любяць збіраць мноства даных на свае ноўтбукі, ім давялося б усё гэта капіяваць на флэшкі перад кожным палётам і арандаваць пасля прыезду ноўтбукі за мяжой. Але думаецца, галоўная прычына — пазіцыя вельмі ўплывовых у ЗША і ЕС бізнесменаў. Яны ад увядзення забароны апынуліся б у вельмі складаным сітуацыі, асабліва тыя, хто імкнецца штогадзіны прысутнічаць на біржы, складаныя праграмы па ўзаемадзеянні з якой загружаны на іх ноўтбукі. За імі стаяць трыльёны долараў узаемных інвестыцый на тэрыторыі заходняга свету, і цярпець нязручнасці яны не збіраюцца.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук

РАЗБІТАЕ СЭРЦА МАНЧЭСТЭРА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Брытанскі прэм'ер Тэрэза Мэй выступіла з кароткай заявай, у якой ахарактарызавала здарэнне як «жахлівую тэрарыстычную атаку». «Мы глыбока спераживаем ахвярам, родным і сваякам пацярпелых», — падкрэсліла Тэрэза Мэй. У знак жалобы над рэзідэнцыяй прэм'ер-міністра на Даўнінг-стрыт быў прыспушчаны дзяржаўны сцяг.

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп назваў арганізатараў выбуху ў Манчэстэры «злавеснымі лузерамі». «Я не буду называць іх пачварамі, таму што ім спадабаецца такі ярлык. Я называю іх лузерамі», — сказаў амерыканскі прэзідэнт падчас свайго візіту ў Віфлеем. Прэзідэнт Трамп таксама паведаміў, што «злавесная ідэалогія павінна быць цалкам знішчана». «Наша грамадства не можа прыняць працяг гэтага кровапраліцця», — сказаў ён падчас сустрэчы з палесцінскім лідарам Махмудам Абасам.

Тым часам паліцыя Манчэстэра арыштавала ў паўднёвай частцы горада 23-гадовага мужчыну ў рамках расследавання тэракта на стадыёне «Манчэстэр-арэна», паведамляюць інфармагенцтвы. Затрыманы падазраецца ў датычнасці да тэракту.

Вядома таксама, што арышты былі праведзены ў раёнах Чорлтана і Эштана. Па апошніх даных паліцыі, затрыманыя некалькі чалавек.

Кансерватары, лейбарысты і іншыя буйныя партыі Вялікабрытаніі прыпынілі свае перадвыбарчыя кампаніі перад усеагульнымі выбарамі 8 чэрвеня пасля выбуху на «Манчэстэр-арэне».

Калі ў ходзе следства версія тэракта не будзе аспрэчаная, то выбух у канцэртнай зале «Манчэстэр-арэна» стане самым крывавым тэрактам у Брытаніі пасля выбухаў у ліпені 2005 года ў Лондане, у выніку якіх загінулі больш за 50 чалавек.

Амерыканская поп-спявачка Арыяна Грандэ выказала спачуванні ў сувязі з гібеллю людзей, якія прыйшлі на яе канцэрт у Манчэстэры. Хоць 23-гадовая выканаўца не пацярпела ў выніку нападу, аднак, з яе слоў, яна перажыла моцнае ўзрушэнне. «Разбітае сэрца, мне вельмі-вельмі шкада. У мяне няма слоў», — такое паведамленне апублікавана ў «Твітары» спявачкі.

На канцэрт Арыяны Грандэ, якая карыстаецца вялікай папулярнасцю ў брытанскіх дзяўчатак-падлеткаў, сабраліся ў асноўным маладыя людзі, было шмат школьнікаў.

■ Хімія поспеху

«ДРУКАВАЦЬ» БУДЗЕМ СВАІМ

Беларускія вучоныя стварылі новы матэрыял для 3D-прынтараў. Па словах дырэктара Інстытута хіміі новых матэрыялаў Нацыянальнай акадэміі навук Уладзіміра АГАБЕКАВА, айчынная распрацоўка заснавана на палімерах, вытворчасць якіх наладжана на нафтаперапрацоўчых прадпрыемствах у Наваполацку і Магілёве. Новы матэрыял стане таннай заменай традыцыйнаму АБС-пластыку, які выкарыстоўваецца ў сферы адытыўных тэхналогій. Праект рэалізуецца ўжо другі год у рамках дзяржаўнай навукова-тэхнічнай праграмы, сваю зацікаўленасць у выніках работы беларускіх навукоўцаў ужо выказалі прадстаўнікі адной з буйных кітайскіх кампаній.

— Мы пайшлі трохі далей і вырашылі рабіць не толькі матэрыял, але і стварыць айчынны 3D-прынтар, — расказаў спецыяліст. — Гэта нескладана, над падобнымі праектамі працуюць студэнты нашых універсітэтаў, некаторыя прыватныя прадпрыемствы. Для ажыццяўлення ідэі супрацоўнічаем з Інстытутам цепла- і масаабмену. Галоўная задача — зрабіць апарат, які зможа працаваць на больш высокіх тэмпературах (гэтага вымагае якраз распрацаваны намі матэрыял) і будзе шырокафарматным. Работа цяпер вядзецца, мы ўжо атрымалі неабходнае абсталяванне.

Як адзначыў **першы прарэктар Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Аляксандр ЦЫГАНОЎ,** гэта ВНУ першай у Беларусі пачала рыхтаваць кадры для сферы адытыўных тэхналогій. У БДТУ ўжо вырабляюць уласныя 3D-прынтары і матэрыялы для іх. Універсітэт таксама шмат займаецца навуковымі распрацоўкамі ў сферы хіміі. Так, цяпер вядзецца работа па стварэнні новых кампазіцыйных матэрыялаў для выкарыстання ў аўтамабільнай і аўтатрактарнай тэхніцы (доследны завод плануецца стварыць у Беларуска-Кітайскім тэхналагічным парку), пошуку спосабаў глыбокай хімічнай перапрацоўкі драўлянай сыравіны, развіцці экалагічных тэхналогій і выкарыстанні айчынай сыравіны для атрымання будматэрыялаў і многіх іншых кірунках.

Па словах **намесніка дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце Інстытута фізіка-арганічнай хіміі НАН Таццяны НЕВАР,** у апошнія гады ўсе распрацоўкі навукоўцаў гэтай установы скіраваны на канкрэтныя вынікі для эканомікі краіны. Так, толькі за апошні час былі створаны ўстаноўкі для водападрыхтоўкі на ЦЭЦ краіны, пад гандлёвай маркай «Фібан» пачалі выходзіць матэрыялы для ачысткі газапаветраных выкідаў. Акрамя гэтага, у інстытуце ствараюць фармацэўтычныя субстанцыі, а таксама БАДы і прэпараты для спартсменаў на іх аснове, распрацоўваюць актыўныя рэчывы, якія выкарыстоўваюцца для лячэння анкалагічных захворванняў і хваробы Альцгеймера.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

■ Узнагароды

ЧАЛАВЕК ПРАЦЫ — ГЭТА ПРЭСТЫЖНА

Прафсаюзы ўручылі прэміі ў галіне працы і творчасці

Сёлета ўзнагарод удастоены прадстаўнікі і калектывы найбуйнейшых прадпрыемстваў і арганізацый у прамысловасці, навуковай, адукацыйнай і медыцынскай сферах. Сярод іх Белтэлекам, Барысаўскі завод медыцынскіх прэпаратаў, «Полацк-Шкловалакно» і іншыя.

Прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі з прысваеннем звання лаўрэата, уручэннем Ганаровага знака, Дыплома за высокія дасягненні ў працы, а таксама ў творчасці ўваходзяць у лік самых прэстыжных прэмій нашай краіны.

— Працавітасць сёння з'яўляецца галоўным рэсурсам, і прафсаюзы штодзённа імкнуцца да таго, каб праца кожнага была заўважана і ацэнена па заслугах, — адзначыў **старшыня ФПБ Міхаіл ОРДА.** — Названыя сёння лаўрэаты ў галіне працы і культуры — заслужаныя людзі, якія захоўваюць адказнасць і адданасць сваёй справе ў любых умовах. Тым самым яны дэманструюць прыклад, што ўсё залежыць ад жадання і стараннасці.

Учора былі ўзнагароджаны таксама пераможцы Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства «Беларускі майстар—2017». Ён праходзіў на працягу года і вызначыў найлепшых спецыялістаў краіны ў 14 прафесіях. Мэта спаборніцтва — павысіць прэстыж чалавека працы, стварыць стымул для далейшага росту кваліфікацыі работнікаў.

Адзначалі і прызёраў Рэспубліканскага конкурсу творчасці працоўных калектываў «Новыя імёны Беларусі—2017». Першае месца заняла менеджар па продажах аддзела збыту Дзяржынскай швейнай фабрыкі «Эліз» Наталля Стэльмах. Ужо трэці год конкурс дае магчымасць работнікам праявіць свае сцэнічныя таленты. Усе ўдзельнікі — непрафесіяналы, працуюць у арганізацыях і на прадпрыемствах, а вольны час прысвячаюць любімай справе. Пры падрыхтоўцы да фінальнага шоу з імі займаюцца найлепшыя вакалісты, харэографы і стылісты краіны, а ў ролі куратараў выступаюць зоркі беларускай эстрады і выдатныя дзеячы культуры.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

Махляр завалодаў больш чым мільёнам долараў

Сталічны махляр выманіў у знаёмых больш за адзін мільён долараў, паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама. Супрацоўнікі праваахоўных органаў затрымалі 31-гадовага раней не судзімага мінчаніна.

Напачатку мужчына працаваў менеджарам адной са сталічных фірмаў, якая займалася продажам аўтазапчастак і маторных масел. Пасля вырашыў заняцца ўласным бізнесам. А каб ён адразу пачаў прыносіць прыбытак, грамадзянін актыўна распачаў пошукі інвестараў — прапаноўваў знаёмым і сябрам укладваць грошы ў развіццё прадпрыемства і атрымліваць адпаведныя дывідэнды. Браць сродкі махляр браў, а вось вяртаць іх, тым больш з працэнтамі, не збіраўся. Сумы складалі ад 3 тысяч да 600 тысяч долараў. Напачатку падманутыя сябры і знаёмыя верылі, што ў бізнесмена ўзніклі часовыя цяжкасці з вяртаннем грошай. Маўляў, яны з'явіліся пры ўрэгуляванні розных пытанняў з партнёрамі ці былі звязаныя з затрымкай груза на мытні. Аднак праз нейкі час зламыснік, калі яго довады ўжо ніхто не ўспрымаў усур'ёз, увогуле перастаў адказваць на званкі і згарнуў дзейнасць у сваім офісе. У міліцыю сталі паступаць заявы ад грамадзян... Як устанавілі праваахоўнікі, за два гады мужчына махлярскім спосабам завалодаў больш чым мільёнам долараў. У адносінах да яго заведзена 15 крымінальных спраў, аднак у міліцыі мяркуюць, што кола пацярпелых можа яшчэ папоўніцца.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■ Хакей. ЧС-2018

Згуляем у Капенгагене

Зборная Беларусі даведалася пра сапернікаў на чэмпіянаце свету ў наступным годзе

Міжнародная федэрацыя хакея апублікавала склады груп на планетарнае першынство 2018 года, якое прымуць дацкія гарады Капенгаген і Хернінг.

Наша зборная на сёлетнім чэмпіянаце заняла 13-е месца, атрымаўшы дзве перамогі ў сямі матчах. Такі вынік дазволіў набраць усяго 880 рэйтынгавых ачкоў і ў класіфікацыі ІІХФ апусціцца з 9-га месца на 10-е, прапусціўшы наперад каманду Нарвегіі. Пасля заканчэння сёлетняга першынства і абнаўлення рэйтынгу стала вядома, з якімі камандамі беларусы сустрэнуцца ў маі наступнага года. Наша зборная згуляе ў Капенгагене ў групе А з камандамі Расіі, Швецыі, Чэхіі, Швейцарыі, Славакіі, Францыі і Аўстрыі. У групе В выступяць Канада, Фінляндыя, ЗША, Германія, Нарвегія, Латвія, Данія і Рэспубліка Карэя. Матчы чэмпіянату свету 2018 пройдуць з 4 па 20 мая.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. *lobazhevich@zviazda.by*

ВЫЙСЦІ З ЛЕСУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Таму лепш апранаць пры паходзе ў лес нешта яркае. Калі ж з куртак дома асаблівага выбару няма, то трэба падумаць над тым, як жа сябе пазначыць, калі вас будуць шукаць. Гэта можа быць які-небудзь капюшон, павязкі на рукавах. Адным словам, тое, што будзе прыкметна кантраставаць на фоне суцэльнага лісця. Перад любой вандроўкай у лес трэба паведаміць родным і блізкім, куды вы збіраецеся і калі плануеце вярнуцца. Гэтая інфармацыя стане пунктам адліку для таго, каб пачаць вас шукаць.

Збіраючыся ў лес, абавязкова пакладзіце ў кошык ці заплечнік паўлітровую бутэльку з несалодкай вадой. Калі маеце хранічныя захворванні — прыхапіце з сабой лекі. Нават калі зараз хвароба, здаецца, «пайшла ў падполле», ад стрэсу яна можа рэзка абвастрыцца. Што да ежы, то лепш узяць штосьці каларыйнае, напрыклад, плітку шакаладу. Адкрытыя ўчасткі цела трэба абараніць ад кляшчоў.

Навошта ў лесе... сшытак?

Самае цяжкае пры падарожжы ў лесе — гэта ісці прама. Чалавечыя ногі маюць адну анатамічную асаблівасць — адна з іх на некалькі міліметраў даўжэйшая за другую. У горадзе ці вёсцы гэта заўважыць немагчыма — мы міжволі выпраўляем крок на гэтую драбязу, арыентуючыся па дарогах ці сцежках. А вось у лесе такіх зручных арыенціраў няма. І таму вандроўнік будзе апісваць сярод дрэў кругі з радыусам 3-4 кіламетры.

Аднак ёсць адзін спосаб, які дазваляе рухацца ў лесе па больш-менш прамой траекторыі. Трэба выбраць дрэва і стаць да яго спінай. Калі вы не ведаеце, куды ісці — выберыце які-небудзь напрамак, які вам падаецца правільным. На ім трэба выбраць другое дрэва. Яны ў вас атрымаліся на прамой лініі. Цяпер трэба выбраць трэцяе дрэва, каб першае аказалася роўна за спінай, а трэцяе — роўна перад вамі. Толькі па такім арыенціры вы здолееце ісці прама.

— Самы лепшы варыянт, як не заблукаць у лесе, — гэта прыгадаць школьныя ўрокі геаграфіі, — раіць Віталь Навіцкі. — Менавіта там вучаць, як правільна карыстацца компасам. Калі ж у вас гэтага маленькага памочніка няма ці вы ніколі ім не карысталіся — гэта не крытычна. Падчас ляснога падарожжа вам абавязкова сустрэнуцца якія-небудзь ямкі, валуны, расшчэпленыя ствалы... Запамінайце гэтыя арыенціры.

Калі ж усе дрэвы здаюцца на адзін капыл, то тут вам дапаможа звычайны агульны сшытак на 96 лістоў. Можна вырываць адтуль аркушыкі і насаджваць іх на галінкі дрэў з такім улікам, каб яны заставаліся ў зоне бачнасці.

Беларускія лясы — не сібірская тайга. У нас працуе добрая сістэма прасек, з дапамогай якіх лес раздзелены на кварталы. Таму, калі вы выйшлі на такую прасеку, яна абавязкова прывядзе вас або да дарогі, або да лініі электрапередачы ці да іншай прыкметы цывілізацыі. І трэба прыслухоўвацца да абстаноўкі навокал. Напрыклад, сабачы брэх можна пачуць за два кіламетры. Гук ад трактара разносіцца на ўдвая даўжэйшую дыстанцыю. Цягнік і ўвогуле можна пачуць на адлегласці да дзесяці кіламетраў. Далёка разносяцца і сігналы аўтамабіляў, з дапамогай якіх шукаюць зніклых у лясах.

Калі ж вы напаткалі па дарозе ручай або раку, то трэба ісці ўніз па цячэнні. Выток ракі звычайна знаходзіцца ў цяжкадаступным глухім месцы. А так любая рака куды-небудзь, але ўпадае. Да таго ж на берагах рэк, як правіла, знаходзіцца шмат людскіх паселішчаў.

Ну а калі выбрацца да заходу сонца не атрымалася, то адзінае, што застаецца, — гэта ўладкоўваць месца для начлегу. Для гэтага ідэальна падыходзяць ямы, якія ўтварыліся ад вывернутых дрэў. Пад вопратку пажадана напіхаць паперы, каб затрымаць цяпло. Развядзіце агонь, калі зямля не сухая, — ён дапаможа адпужваць драпежных жывёл. Піць ваду з ручаёў і лужын нельга, як бы спакуслівa гэта ні выглядала, — без спецыяльнай апрацоўкі вы праглыняце мільярды шкодных бактэрый. Што-небудзь яркае неабходна прымацаваць на дрэве, каб вас заўважыла выратавальная група. Бо калі яна пройдзе непадалёк ад вас і нічога не заўважыць, то раён будзе лічыцца адпрацаваным. І пошукі рызыкуюць зацягнуцца на большы тэрмін...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
schklennik@zviazda.by

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

извещает о проведении открытого аукциона по продаже здания котельной, принадлежащего ОАО «Минское производственное кожевенное объединение», Минский район

Лот №1. Здание котельной с инв. №600/С-42335, 1988 г.п. Назначение: здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий. Общая площадь – 2486,4 м². Площадь застройки – 2 236 м². Составные части и принадлежности: одноэтажное блочное здание котельной (литер А1/бл) с пристройкой – 1. Начальная цена продажи, с НДС – 2 400 000, 00 бел. руб. Задаток – 120 000,00 бел. руб. Местонахождение Лота №1: Минская обл., Минский р-н, д. Гатово

ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК

Земельный участок площадью 0,8869 га с кадастровым номером 623684300001001047. Целевое назначение земельного участка: земельный участок для обслуживания здания котельной. Право постоянного пользования. Описание права, ограничения (обременения) прав: – ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах особо охраняемых природных территорий, площадь 0,8869 га; – ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0,1408 га;- ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,0600 га; – ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000В, площадь 0,0432 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли-продажи Объекта.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 0,5% (ноль целых пять десятых процента) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона

Аукцион состоится 27.06.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже котельной ОАО «Минское производственное кожевенное объединение», Минский район, проводимом 27 июня 2017 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений 23.06.2017 в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактные лица для осмотра Объекта – Рудько Николай Александрович, тел. 8 (029) 700-74-91, Лифанова Оксана Николаевна, тел. 8 (029) 701-55-94.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

☎ Организатор аукциона:
8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

ПЕРАД ЯГО КАБІНЕТАМ НІКОЛІ НЕ БЫЛО ПРЫЁМНАЙ,

або Запаветы чалавека-эпохі

24 мая спаўняецца 90 гадоў двойчы Герою Сацыялістычнай Працы Уладзіміру БЯДУЛЮ

З Уладзімірам Лявонцьевічам Бядулем за гады журналісцкай працы давялося сустракацца не раз. Апошняе вялікае інтэрв'ю выйшла ў нашай газеце адзінаццаць гадоў таму, у лютым 2006-га. Тады яшчэ Уладзімір Лявонцьевіч быў у страі і адзначаў 50-годдзе кіраўніцтва сваёй гаспадаркай — ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарча-вытворчым кааператывам «Савецкая Беларусь».

Але гаспадарку сваю ён па-ранейшаму называў калгасам. І расказваў, як спрабаваў захаваць назву афіцыйна: «Я прасіў-маліў: «Пакіньце дзве назвы калгасу, які ўзначальваў Кірыл Пракопавіч Арлоўскі, як асаблівай, сапраўды гістарычнай з'яве ў калгасным будаўніцтве СССР і на заходніх рубяжах краіны — нашай «Савецкай Беларусі». Дзе там! Добра яшчэ, што ў назве кааператыва пакінулі і нашу ўзнагароду, і словы «Савецкая Беларусь». Крыўдна бывае, калі адным махам адсякаецца тое, чым жыло нават не адно пакаленне. Да свайго мінулага трэба ставіцца больш беражліва».

Тады ж Уладзімір Бядуля расказваў, як пачынаў сваю работу ў калгасе. У 1955 годзе быў такі партыйны заклік: узначаліць адсталыя гаспадаркі і вывесці іх на перадавыя рубяжы. І ён падаў заяву ў шэрагі «трыццацітысячнікаў» — так называлі тых, хто ішоў на сяло па закліку ЦК КПСС, — прасіў даць адсталую гаспадарку ў родных мясцінах. У Пінску прайшоў трохтыднёвыя старшынёўскія курсы. Пасля іх 28-гадовы выпускнік быў накіраваны намеснікам старшыні адной з гаспадарак Высокаўскага раёна. А праз паўгода, 21 лютага 1956-га прыняў самы слабы калгас гэтага раёна «Савецкая Беларусь».

— Выбралі мяне на здзіўленне лёгка, — працягваў Бядуля. — Усе прагаласавалі «за», толькі адзін чалавек — «супраць». Людзям жылося цяжка. Паказчыкі былі настолькі нізкія, што, бывала, па выніках года работнік яшчэ заставаўся вінаватым калгасу! Кралі ўсё, што можна панесці.

Пачынаў малады старшыня з выкаранення крадзяжу. З транспарту ў яго былі веласіпед ды падвода, але ўсюды стараўся паспяваць, у кожны куточак заглядваў. Давялося памяняць многіх кіраўнікоў сярэдняга звяна, хто мог паблытаць сваю кішэню з калгаснай. Дабіўся таго, што ў статуце гаспадаркі паявіўся радок аб тым, што работабрак не аплачваецца. Паступова сталі плаціць за працадні не толькі збожжам і кармамі, але і грашыма. Так памалу і паднімалі сваю гаспадарку.

І вось дакладная цытата з інтэрв'ю больш чым дзесяцігадовай даўніны: «Цяпер з задавальненнем можна адзначыць, што за ўсе пяцьдзясят гадоў у калгасе не было ніводнай не толькі галоднай, але і паўгалоднай зімоўкі для статка. А зімы за паўвеку здараліся розныя: працяглыя, суровыя. Думаю, што любы чалавек, знаёмы з сельскай гаспадаркай, пагодзіцца з такой простай формулай: як скаціна галадае, значыць, гаспадара ў яе няма, калгас гэта ці асабісты падворак».

Адчуваеце, як гэта актуальна сёння? Апошні сказ, думаю, варта было б вялікімі літарамі набраць на камп'ютары кожнаму кіраўніку сельгаспрадпрыемства. Напрыклад, паўтара года таму ў многіх гаспадарках сітуацыя з кармамі складвалася блізкая да крытычнай, і ўсе ківалі на капрызы надвор'я...

Згадалі мы з Уладзімірам Лявонцьевічам тады і яго грамадскую работу, ён узначальваў Брэсцкае абласное аддзяленне Беларускага фонду міру. Ён загаварыў вельмі сур'ёзна: «Мір — першае, што патрэбна чалавеку пры любых умовах, пры любым раскладзе жыцця. Зараз мы развучыліся цаніць мір. А калі і цэнім, то павярхоўна, фармальна, недастаткова. Сучасны чалавек мір і стабільнасць амаль не заўважае, успрымае іх як ваду і паветра, якія былі і будуць заўсёды. Але гэта памылковая пазіцыя. У цяперашнім свеце нават далёкія, на першы погляд, войны могуць нечакана закрануць». У 2006 годзе, калі навокал нас было адносна спакойна, ніхто падумаць не мог пра канфлікт ва Украіне, пра патокі бежанцаў у Еўропе. Чалавек, памяць якога захавала дзіцячыя ўспаміны пра вайну, так пранікнёна гаварыў аб каштоўнасці міру. Мы сапраўды тады не ўсведамлялі, цяпер вось пачынаем.

Яшчэ Бядуля пры кожнай нагодзе гаварыў пра каштоўнасць і важнасць кнігі. Прыгадваецца яшчэ адно невялічкае інтэрв'ю да свята пісьменства ў Камянцы ў 2005 годзе. Там вельмі хораша і шчыра, як ён толькі ўмее, гаварыў пра кнігу, пра тое, што кнігу трэба падтрымліваць і прапагандаваць у эпоху наступлення камп'ютараў. І вось 2012-ы мы аб'яўляем Годам кнігі... Дзе толькі магчыма, калгасны старшыня падкрэсліваў ролю духоўнасці. І не толькі гаварыў аб гэтым, вельмі шмат рабіў на ніве духоўнасці. Царкву ў вёсцы ўзвялі ў 2000 годзе фактычна за сродкі гаспадаркі. А калгасны музей хлеба быў свайго роду духоўным цэнтрам Дома культуры. Яго наведвалі ўсе госці.

Дом культуры ў Расне, дарэчы, пачалі будаваць, як толькі справы калгаса пайшлі ўгору. З яго сцэны выступалі Аляксандра Пахмутава і Мікалай Дабранраваў, Людміла Зыкіна, Валерый Лявонцьеў, Леў Лешчанка, «Песняры», тройчы тут сустракалі Рускі народны хор імя Пятніцкага. У гасцях у калгаснікаў бывалі Юрый Левітан, Святаслаў Рыхтар, Міхаіл Ульянаў, Андрэй Вазнясенскі, Яўген Еўтушэнка, многія іншыя дзеячы культуры і мастацтваў. Галоўнае, што гаспадарка пры Бядулю імкнулася зрабіць музыку, жывапіс даступнымі для дзяцей жывёлаводаў, механізатараў, усіх вяскоўцаў.

З жонкай Аніссяй Трафімаўнай.

У вёсцы не проста адкрылі першую ў раёне сельскую музычную школу, але зрабілі так, што ў ёй выкладалі самыя лепшыя педагогі. Некалькі гадоў запар настаўніц музыкі з горада і назад вазіла калгасная машына. «А як я ўгаворваў вядомага тады музыканта і педагога Міхаіла Солапава ўзначаліць музычную школу — асобная гісторыя, — расказваў Уладзімір Лявонцьевіч. — Паўтары гады ўгаворваў і знайшоў-такі слабінку, якая стала апошняй кропляй. Тады, у 70-я, было вельмі прэстыжна мець сваю «Волгу», але ў чарзе па яе стаялі вельмі доўга. Я паабяцаў Солапаву машыну, і ён пераехаў да нас. Аўтамабіль потым дырэктар школы набыў, але і ў рабоце не прайграў: у вёсцы таленавітых дзяцей аказалася не менш, чым у горадзе».

А вось яшчэ адна гісторыя з «Волгай», якую варта расказаць. Быў у «Савецкай Беларусі» механізатар, які ў полі як бог. Ніхто з ім не мог параўнацца ў той жа якасці worрыва. Але вось бяда, да чаркі адчуваў слабіну. Выхаваўчую работу з ім як толькі не праводзілі, а чалавек час ад часу «з рэек сыходзіў». У яго сваякі ў Польшчы жылі. Аднойчы старшыня яму нібы жартам сказаў: «Не будзеш піць тры гады — на чацвёрты да сваякоў на «Волзе» паедзеш. Уяўляеш, як падруліш на шыкоўным аўто, а твае замежныя родзічы аж раты паразяўляюць?» І што вы думаеце? Не дакрануўся да гарэлкі ўвесь выпрабавальны тэрмін. Праўда, у райвыканкаме потым Бядулю выхоўвалі: «У нас, казалі, ідэальна цвярозыя палкоўнікі ў чарзе вунь колькі часу стаяць, а ты ГАЗ-24 трактарысту, былому п'яніцу абяцаеш».

Але ж да чалавека патрэбны індывідуальны падыход, гэта быў стыль Бядулі. Даярак у санаторый ён адпраўляў ледзь не прымусова, рашэннем праўлення. Потым прыходзілі, дзякавалі за клопат. І пяцьдзясят гадоў адпрацаваў у кабінеце, перад якім ніколі не было прыёмнай. Гаварыў, што работнік мог зайсці да яго альбо пазваніць у любы час.

Пра сваё асабістае жыццё Уладзімір Бядуля не вельмі любіў гаварыць на сустрэчах з журналістамі. І толькі нядаўна, у кнізе Андрэя Юрэнева я прачытала, што амаль трыццаць гадоў ён з сям'ёй пражыў у старэнькай вясковай хаце. А ў прыстойны дом пераехаў напярэдадні свайго 60-годдзя і ўручэння другой Залатой Зоркі Героя Сацыялістычнай Працы, калі большасць калгаснікаў жыла ў асабняках і двухкватэрных катэджах.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by
Фота з архіва сям'і Ул. Бядулі.

Извещение о проведении 26 июня 2017 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «БЕЛРЫБА»

Предмет торгов
